*Т.І.Жыркевіч (Мінск)*

# ТЫПАЛАГІЧНЫЯ СЫХОДЖАННІ ТВОРЧАСЦІ МАКСІМА БАГДАНОВІЧА І ДЗІМЧА ДЭБЕЛЯНАВА

Як вядома, у развіцці сусветнай літаратуры дзейнічаюць агульныя заканамернасці, якія назіраюцца ў творчасці тых ці іншых пісьменнікаў (распрацоўка сюжэтаў, вобразаў, паэтычных сродкаў, форм і жанраў). Творчасць Максіма Багдановіча – не выключэнне. Мы паспрабуем на яго прыкладзе разгледзець некаторыя моманты, звязаныя з праблемай тыпалогіі. У прыватнасці, тыпалагічныя сыходжанні з балгарскім паэтам-сімвалістам Дзімчам Дэбелянавым.

Пры супастаўленні жыцця і творчасці названых паэтаў перш за ўсё нельга не адзначыць некаторыя факты, якія здзіўляюць сваім падабенствам.

Абодва яны пражылі нядоўгае жыццё (Максім Багдановіч 25 гадоў, Дзімча Дэбелянаў – 29) і пакінулі пасля сабе адносна невялікую, але вельмі арыгінальную і яскравую па мастацкіх вартасцях, паэтычную спадчыну. У беларускага песняра – гэта прыжыццёвы зборнік "Вянок", у яго балгарскага калегі – невялікі зборнічак "Стихотворения", які быў выдадзены ўжо пасля смерці аўтара пры дапамозе яго сяброў Дзімітра Падвырзачава, Мікалая Ліліева і Канстанціна Канстанцінава ў 1920 годзе.

На хвалі захаплення новымі плынямі сусветнай паэзіі і М.Багдановіч, і Дз.Дэбелянаў праявілі цікавасць да французскага сімвалізму. У прыватнасці, можна адзначыць зварот да цыкла вершаў Поля Верлена "Мудрасць" (Sagesse), які прыцягваў увагу абодвух паэтаў тонкасцю і музычнасцю верша, разнастайнасцю і плаўнасцю рытма. Строй паэтыкі Верлена, яго прынцып "Музыка перш за ўсё!"



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

яны перанеслі ва ўласную лірыку. Параўнальны аналіз дазваляе выявіць пэўныя верленаўскія матывы. А на гэта ёсць яшчэ і своеасаблівыя падказкі саміх паэтаў. М.Багдановіч, напрыклад, да многіх сваіх вершаў даваў эпіграфы, узятыя з паэзіі Верлена, Сюлі-Прудома і іншых. Дэбелянаў жа такую падказку даў у апошняй страфе цыкла "Под сурдинка". Але тут не толькі страфа, увесь цыкл сведчыць пра блізкасць па эмацыянальнасці і вобразнасці да першай часткі "Мудрасці" Верлена.

Сыходжанні ў поглядах мы знаходзім таксама і ў адносінах да рускай літаратуры. Гэта прысутнасць у ранняй творчасці матываў лірыкі Ф.Цютчава і А.Фета, а пазней А.Блока. Апошні быў асабліва блізкі Дзімчу Дэбелянаву, што выяўлялася не так знешне, як унутрана. Лірыка Блока ўздзейнічала на паэта характарам пачуццяў, якія датычылі мінулага, успамінаў. Матывы настальгіі, мары аб цішыні і спакоі свайго старога дома, ад якога адарвала жыццё, праходзяць праз многія вершы Дэбелянава. Таму не выпадкова балгарскія літаратуразнаўцы называюць Дзімча Дэбелянава – "паэтам успамінаў"[4]. Вобразы, якія паўстаюць у плыні ўспамінаў, ператвараюцца ў жывыя вобразы яго лірыкі і дапамагаюць знайсці прытулак для яго пакутлівай душы. Успаміны даюць магчымасць паэту ацаніць сябе і знайсці выйсце з становішча, якое зневажае годнасць чалавека. (У якасці прыклада можна прывесці вершы "Помниш ли, помниш ли тихия двор...", "Да се завърнеш в бащината къща..." і г.д.).

Максіма Багдановіча з Блокам збліжае пошук шляхоў пераадолення чалавечай адзіноты, ізаляванасці, шляхоў зліцця асабістага светаўспрымання з нечым агульным, сусветным. Паказальны ў гэтым плане верш "Шмат у нашым жыцці ёсць дарог...". Тут супрацьстаўленне сэнсавых слоў і выразаў "мы сайдзёмся, спаткаемся там" і "адзінока", "паспяшаліся так" сведчаць пра імкненне пераканаць людзей, каб ядналіся.

Уплыў А.Блока на выбар сюжэтнай тэматыкі М.Багдановіча адчуваецца ў вершы "Дзве смерці", дзе паўстае тэма самагубства чалавека, даведзенага да адчаю. Кароткі, але канкрэтны эпіграф да верша, які матывуе ўзнікненне сюжэта верша, дазваляе суаднесці яго непасрэдна з блокаўскім "Из газет".

Такім чынам, навідавоку падобныя ўплывы літаратур рускай і заходнееўрапейскай на беларускага і балгарскага паэтаў. Але трэба зазначыць, што, прыняўшы ўсё лепшае з лірыкі Верлена, Блока і



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

іншых мастакоў слова, кожны з іх знайшоў і свой набор выяўленчых сродкаў, свой асабовы стыль.

Агульнаць некаторых тэм, сюжэтаў, вобразаў у лірыцы М.Багдановіча і Дз.Дэбелянава абумоўлена таксама і тым, што абодва паэты стваралі ў адну эпоху - пачатку XX стагоддзя, калі прадчуваннем змен дыхалі ўсе больш-менш значныя паэты. Нестабільны, як у эмацыйным, так і ў сацыяльным плане, час нараджаў шмат супярэчнасцяў у свядомасці людзей. І гэта знайшло адлюставанне ў паэзіі.

Лірыка Дэбелянава – гэта адзінства складаных дысанансаў: вера і нявер'е, мара і незадаволенасць рэчаіснасцю, ідэал і проза жыцця; гэта адлюстраванне пакутлівых духоўных пошукаў, канфлікту паэта з жыццём.

Аз умирам и светло се раждам –
разнолика, нестройна душа,
през дена неуморно изграждам,
през нощта без пощада руша.

*Черна песен*

(Я паміраю і святлом нараджаюся – // разнатварая, нязграбная душа, // удзень нястомна будую, // уноч бяз літасці разбураю. – Падрадкоўны пераклад наш. – Т.Ж.).

Напэўна, пачуццё разрыву з бязрадаснай рэчаіснасцю, пакуты ад трагічных прадчуванняў абумоўлены былі агульным настроем грамадства, калі на зломе эпох у літаратуры незвычайна абвастрылася адчуванне плыннасці часу, чалавечай асуджанасці перад "канцом веку". Тэма драматызму чалавечага жыцця аб'ядноўвае абодвух славянскіх паэтаў. У Багдановіча яна паўстае як вынік асабістага лёсу – раннім разуменнем асуджаннасці прад невылечнай хваробай. У Дэбелянава – у выніку немагчымасці ажыццявіць свае духоўныя парывы ва ўмовах тагачасцай рэчаіснасці, якая не спрыяла рамантычнаму настрою.

Абставіны жыцця ў сукупнасці з захапленнем сімвалізмам абумовілі з'яўленне ў лірыцы паэтаў агульнай для іх тэмы смерці.

Элегічнасць стала адным з самых характэрных момантаў паэзіі Дзімча Дэбелянава. Але вобраз смерці ўзнікае хутчэй не з-за песімітычных адносін да рэчаіснасці, а пад уплывам асобных перажыванняў, ад невырашальнага канфлікта самога паэта з сучаснасцю. Лірыка Дэбелянава адлюстроўвае складаны, пакутлівы духоўны свет мастака, які імкнецца знайсці царства жаданай мары, але павінен весці нікчэмнае існаванне дробнага чыноўніка.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

У Багдановіча прысутнічаюць іншыя інтанацыі пры абмалёўцы вобраза смерці. Паэзія яго – гэта пратэст супраць смерці, непрыняцце яе як страшэннай несправядлівасці, калі ў небыцці знікае чалавек з яго унікальным светаадчуваннем, непаўторнасцю думак і пачуццяў. Нават сярод разважанняў пра неназбежнасць смерці прасочваецца думка пра значнасць чалавечага жыцця:

Жывеш не вечна, чалавек, --
Перажыві ж у момант век!

Вялікае распаўсюджванне ў сімвалістычнай паэзіі пачатку XX стагоддзя набыла урбаністычная тэма. Яна таксама выразна прадстаўлена і ў творчасці разглядаемых паэтаў.

Пры распрацоўцы вобраза горада абодва мастакі зведалі пэўны ўплыў А.Блока, але змаглі знайсці потым свае непаўторныя выяўленчыя сродкі, якія больш за ўсё адлюстроўвалі іх успрыманне, душэўны настрой. Так, у Дэбелянава асабліва вылучаецца верш "Спи градьт" (Горад спіць). У ім супрацьпастаўленне душэўных парываў паэта і рэчаіснасці набывае найбольшую канцэнтрацыю. Аўтар у моцных па эмацыянальнасці вобразах увасобіў перажыванні гарадской беспрытульнасці, пануючага ў сталіцы адчужэння, пратэсту, які выклікае горад у нявольнага начнога пакутніка.

Спи градът в безшумните тъми,
на нощта неверна верен син,
бродя аз бездомен и самин
а дъждът ръми,ръми,ръми...

(Спіць горад у бясшумнай цемры, // начы нявернай верны сын, // вандрую я бяздомны і адзін // а дождж імжыць, імжыць, імжыць... – Падрадкоўны пераклад наш. – Т.Ж.).

Тую ж беспрытульнасць і нуду мы бачым у апісанні горада Багдановічам. Паэт шкадуе, што ў горадзе "няма прастора дзеля прыроды буйных сіл", ён варожы да "палёў, лясоў, капцоў, магіл". Прадметнасць і насычанасць вулічных краявідаў узмацняюць адзіноту і робяць горад змрочным.

Па-рознаму, арыгінальна, паэты знаходзяць выйсце, каб вызваліцца ад улады горада. Багдановіч бачыць яго ў зліцці з прыродай, якая ўрываецца на вуліцы "дзікім хмелем" "сп'янелай мяцелі", "гулянкай" міфічнага пана Падвея. Тут можна адчуць водгукі блокаўскіх "снежных" сімвалаў. Але ж Багдановіч падае іх пры дапамозе беларускай міфалогіі, родных фальклорных вобразаў. Гэтая асаблівасць адводзіць увагу ад сацыяльна-гістарычнага асэнсавання тэмы ў бок спакушальных "чароўных прынад" горада.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Дзімча Дэбелянаў ад гарадскога бяздушша і адчужанасці паглыбляецца ў свет успамінаў, якія гораду надае рамантычнае святло, што ідзе ад дзяцінства з яго яскравымі вобразамі роднага дома. Таму кантрастна гучаць радкі, якія малююць рэальнае становішча героя, з тымі, дзе адлюстраваны пакутлівыя, але ж прыемныя ўспаміны.

Образът на милото дете,
нявга озарило моя праг,
в спомени възкръсва – чист и драг--
и скръбта расте, расте,расте…

(Вобраз мілага дзіцяці // калісці асвяціў мой парог, // ва ўспамінах уваскрэс – чысты і дарагі – // а туга расце, расце, расце… – Падрадкоўны пераклад наш. - Т.Ж.).

Такім чынам, М.Багдановіч і Дз.Дэбелянаў, зведаўшы пэўныя ўплывы сімвалістычнай распрацоўкі вобразаў, суадносячы з уласнымі эстэтычнымі поглядамі, стварылі свае непаўторныя сістэмы паэтыкі. У абодвух сімволіка далёкая ад наўмыснасці, абстрактнай невыразнасці, туманнага іншаказання. У іх адчуваецца зямная сіла пачуццяў і слоў, а за сімваламі стаяць канкрэтныя радасць і нуда, жыццё і пакуты.[redacted].

---

[1] Багдановіч М. Поўны збор твораў: У 3 тамах. Т.1. Вершы, паэмы, пераклады, наследванні, чарнавыя накіды. Мінск, 1992.

[2] Дебелянов Димчо. Лирика. Велико Тырново, 2000.

[3] Дончев Николай. Пол Верлен и Димчо Дебелянов. В кн.: Николай Дончев. Литературни и мемоарни этюди. Избрани произведения. София, 1978.

[4] Зарев Пантелей. Димчо Дебелянов. В кн.: Пантелей Зарев. Панорама болгарской литературы. Т.1. Москва, 1976. С.286.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова